области создания музейного продукта, но и дополняют основную, культурно-образовательную функцию музеев, а также служат возможностью для их финансирования.

Кроме раскрытия правомочий музеев в отношении сложных объектов интеллектуальной собственности, видится возможность возмещения затрат на создание музейного продукта, в том числе за счет введения музеями дополнительных платных услуг.


*1.* Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь. – URL: http://pravo.by/.

*2. Беспалый, Ю. Н.* Определение правового режима сложных объектов интеллектуальной собственности / Ю. Н. Беспалый // Вестн. Полоц. гос. ун-та. – 2014. – № 6. – С. 142.

*3. Лосев, С. С.* Научно-практический комментарий к Закону Республики Беларусь «Об авторском праве и смежных правах» / С. С. Лосев. – Минск : Бизнесофсет, 2013. – 299 с. : табл.

*4.* Теплица социальных технологий: [сайт]. – URL: http://te-st.ru /2015/05/20/museums-and-technologies.

*5.* http://www.ctv.by/novosti-minska-i-minskoy-oblasti/v-belarusi-razrazilsya-skandal-za-pravo-izobrazheniya-nesvizhskogo.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ


***Д. В. Герасімёнак,***
*аспірант кафедры гісторыі*
*Беларусі і музеязнаўства,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў*


## ПРАБЛЕМЫ МУЗЕЕФІКАЦЫІ СЯДЗІБ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ: СТАН І ПЕРСПЕКТЫВЫ

Сядзібы ў мінулым з’яўляліся найбольш выразнымі цэнтрамі сацыякультурнага жыцця Беларусі і ўключалі ў сябе палацы і сядзібныя дамы, гаспадарчыя і вытворчыя пабудовы, капліцы, сады, паркі, водныя сістэмы, а таксама малыя архітэктурныя формы. Усе архітэктурныя і ландшафтныя элементы былі аб’яднаны адзінай логікай планіровачнай пабудовы, ствараліся ў адпаведнасці са стылявымі прынцыпамі пэўнай эпохі.

Фарміраванне беларускіх сядзіб адбывалася на працягу некалькіх стагоддзяў адпаведна з агульнаеўрапейскімі тэндэнцыямі. Мясцовыя традыцыі, гістарычныя і сацыяльна-экана-

мічныя ўмовы, лад жыцця, эстэтычныя густы ўладальнікаў аказвалі значны ўплыў на гэты працэс. Сядзібы ператвараліся ў развітыя гаспадарчыя комплексы, станавіліся цэнтрамі сацыякультурнага жыцця рэгіёна. У планавым вырашэнні сядзіб вялікую ролю адыгрывалі формы рэльефу, натуральная раслінасць, прыродна-кліматычныя ўмовы. У выніку працяглага гістарычнага сінтэзу складвалася не проста сядзіба, але і адбывалася фарміраванне своеасаблівага культурна-гістарычнага асяроддзя пэўнай мясцовасці [7, с. 7–9]. Прыкладам такіх утварэнняў могуць служыць сядзібы ў Лошыцы (г. Мінск), в. Красны Бераг Жлобінскага раёна і інш.

Уласна музеі-сядзібы на тэрыторыі Беларусі пачалі складвацца яшчэ з XIX ст. Мясцовае дваранства канцэнтравала ў сваіх родавых гнёздах калекцыі каштоўных прадметаў, стварала палацы і паркі, разлічаныя на «музейнае» ўспрыманне наведвальнікамі-гасцямі. Аднак пасля рэвалюцыі 1917 г. шматлікія сядзібы, якія належалі землеўладальнікам-дваранам, былі нацыяналізаваны, у некаторых з іх былі адчынены грамадскія ўстановы, так, напрыклад, у в. Краскі Валкавыскага раёна – санаторый, в. Сноў Нясвіжскага раёна – шпіталь, в. Галавічполле Шчучынскага раёна – дом-інтэрнат і г. д.

Большасць сучасных музеяў-сядзіб на тэрыторыі Беларусі – мемарыяльныя, яны захаваліся і выкарыстоўваюцца як музеі дзякуючы асобе таго ці іншага дзеяча гісторыі ці культуры, якой яны некалі належалі (Т. Касцюшкі, І. Рэпіна, Ф. Багушэвіча і інш.). Сядзібы, не звязаныя з імёнамі выдатных асоб, былі альбо разбураны, альбо прыстасаваны пад розныя грамадскія і гаспадарчыя патрэбы. Фактычная безгаспадарчасць у адносінах да многіх унікальных сядзібных комплексаў стала прычынай іх кепскага становішча або поўнага знікнення.

Сучасная дзяржаўная палітыка ў галіне захавання і выкарыстання помнікаў гісторыка-культурнай спадчыны ўвасабляецца ў праграмах «Замкі Беларусі» і «Культура Беларусі», якія накіраваны на адраджэнне гісторыка-культурных аб’ектаў. Але аднаўляюцца, як правіла, найбольш вядомыя помнікі архітэктуры, якія ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь (сядзіба Нямцэвічаў у в. Скокі Брэсцкага раёна, Агінскіх (Агіньскіх) у в. Залессе Смаргонскага раёна, Швыкоўскіх у г. Пружаны і інш.). Астатнія аб’екты пакідаюцца па-за ўвагай. Да гэтага трэба дадаць, што



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

далёка не ўсе архітэктурныя помнікі ўнесены ў названы спіс. Гэта азначае, што іх лёгка могуць прадаваць, перабудоўваць на свой лад і нават зносіць. Напрыклад, мясцовым аграпрадпрыемствам была зруйнавана і фактычна поўнасцю знішчана сядзіба XIX ст. каля в. Белавусаўшчына Пружанскага раёна [2].

На 2014 г. у Дзяржаўным спісе знаходзяцца 173 сядзібнапаркавыя комплексы. Аднак, як адзначае начальнік аддзела па ахове гісторыка-культурнай спадчыны ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Наталля Хвір: «Дзяржаўнай падтрымкі па сядзібах практычна няма. Міністэрства культуры не можа фінансаваць усе аб’екты» [4]. Відавочна, што ў цяперашні час адзіны варыянт выратаваць сядзібы – перадаць іх прыватным асобам. Толькі тады з’явіцца і шанс на іх адраджэнне. Хаця ў выпадку прыватызацыі або арэнды сядзібнага комплексу непазбежна ўзнікае праблема не толькі яго захавання, але і прыстасавання, і выкарыстання.

У справе захавання і аховы гісторыка-культурнай спадчыны неабходны кантроль з боку адпаведных дзяржаўных арганізацый. Аднак у нарматыўных дакументах, якія рэгулююць дадзены кірунак дзейнасці, адсутнічае само паняцце «музеефікацыя» (гл.: Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь» [1].

Зыходзячы з айчыннай практыкі ў галіне гісторыка-культурнай спадчыны, відавочна, што музеефікацыя ўяўляе сабой комплекс мер па захаванні і ахове аб’екта гісторыка-культурнай спадчыны (кансервацыя, рэстаўрацыя, аднаўленне і інш.) і яго далейшае прыстасаванне для музейных мэтаў. Дадзены працэс ажыццяўляецца пры непасрэдным кантролі з боку ўпраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

Вопыт краін-суседзяў паказвае іншае разуменне гэтай праблемы. Так «Российская музейная энциклопедия» вызначае музеефікацыю як кірунак менавіта музейнай дзейнасці, які заключаецца ў пераўтварэнні гісторыка-культурных або прыродных аб’ектаў у аб’екты музейнага паказу з мэтай максімальнага захавання і выяўлення іх гісторыка-культурнай, навуковай, мастацкай каштоўнасці [5].

Падобная невыразнасць заканадаўства непазбежна выклікае шэраг праблем па захаванні і выкарыстанні, у тым ліку і музей-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ным, сядзіб як аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. У прыватнасці, з аднаго боку, не ясна, ці варта лічыць адноўленую з руін пры дапамозе сучасных будаўнічых матэрыялаў і тэхналогій сядзібу аб'ектам гісторыка-культурнай спадчыны, з другога – як неабходна захоўваць сядзібу: як асобны будынак; як комплекс пабудоў; ці патрэбна ўключаць у сферу захавання акаляючае асяроддзе, гістарычна звязанае з сядзібай.

Складанасць і шматграннасць сядзібы як комплексу архітэктурных, ландшафтных, гаспадарчых аб'ектаў абумоўлівае складанасць і комплексны характар яе выкарыстання. На наш погляд, менавіта музеефікацыя можа выступаць тым сродкам захавання гісторыка-культурнай спадчыны, які здольны не толькі зберагчы, але і выкарыстаць сядзібы пад патрэбы сучаснага грамадства.

Пры музейным выкарыстанні ў адносінах да кожнай складаючай сядзібнага комплексу ўжываюцца свае метады музеефікацыі. У сядзібным доме, як правіла, захоўваецца або ўзнаўляецца абсталяванне жылога дома і ствараюцца гісторыка-біяграфічныя экспазіцыі, аналагічна як і ў дамах-музеях. Імкненне падаць сядзібу ў яе цэласнасці сёння дыктуе аднаўленне парку, надворных пабудоў, малых архітэктурных формаў і інш. Тэрыторыя, ахопленая музеефікацыяй, можа пашырацца, часам у гэты працэс уключаюцца бліжэйшыя вёскі, а таксама гістарычна звязаны з сядзібай ландшафт [6].

Некаторыя даследчыкі лічаць, што толькі пры выкарыстанні сядзібы ў якасці культурнага цэнтра можна гаварыць аб чыста музейным выкарыстанні сядзібнага комплексу. Аднак трэба адзначыць, што выкарыстанне сядзіб іншым чынам не выключае іх інтэграцыі ў музейнае асяроддзе. Для гэтага немузейныя ўладальнікі сядзібных комплексаў павінны быць зацікаўлены ў іх частковым музейным выкарыстанні (напрыклад, правядзенне аглядных экскурсій і г. д.), несці адказнасць за захаванасць аб'екта гісторыка-культурнай спадчыны і за даступнасць яго для наведвання [6]. Прыкладам такога выкарыстання можа служыць сядзіба Чапскіх у аграгарадку Прылукі Мінскага раёна, дзе ўладальнік сядзібы – РУП «Інстытут аховы раслін» – узяў на сябе абавязкі па ахове і захаванні, а таксама арганізаваў бясплатны доступ для наведвальнікаў дадзенай гісторыка-культурнай каштоўнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На наш погляд, для прыстасаваных пад сучаснае выкарыстанне сядзібных комплексаў уяўляецца магчымым і больш эфектыўным прынцып іх развіцця як гісторыка-культурных і прыродных тэрыторый, якія ахоўваюцца дзеючым заканадаўствам нашай краіны: арганізацыя тэрыторыі ў больш шырокіх гістарычна абумоўленых гаспадарчых межах, чым ахоўная зона ці ландшафтны парк. Яна можа ўключаць не толькі архітэктурны комплекс, сядзібны парк і гаспадарчы двор, але і акаляючае асяроддзе, гістарычна звязанае з сядзібай. У гэтым выпадку ствараецца своеасаблівы музейны, культурна-адукацыйны, турыстычны комплекс, а сама сядзіба становіцца арганічнай часткай сацыякультурнай прасторы рэгіёна.

Ініцыятарамі ў гэтай справе могуць выступаць як дзяржаўныя, так і прыватныя некамерцыйныя арганізацыі, якія займаюцца захаваннем гісторыка-культурнай спадчыны, у тым ліку і музеі. Для рэалізацыі існуючых магчымасцей захавання і выкарыстання (як музейнага, так і немузейнага) сядзібных комплексаў неабходна далейшае ўдасканаленне нарматыўна-прававой базы і жаданне захаваць гэтыя комплексы менавіта як аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны.


*1.* Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь: Закон Рэсп. Беларусь, 9 студз. 2006 г., № 98-З [Электронны рэсурс]. – URL: www.pravo.by/main.aspx.

*2.* Каля Пружан зруйнавалі апошнюю драўляную шляхецкую сядзібу / Г. Канцавік // Беларускія рэгіянальныя навіны [Электронны рэсурс]. – URL: http://regionby.org. – Дата доступу: 01.11.2014.

*3. Каулен, М. Е.* Музеефикация как одно из основных направлений музейной деятельности / М. Е. Каулен // Экологические проблемы развития музеев-заповедников : материалы X Всерос. науч. конф., Москва, 15–17 нояб. 2005 г. – М. : Институт Наследия, 2008. – С. 35–50.

*4. Минкевич, Л.* Не продаются и не реставрируются. Сотни старинных усадеб продолжают разрушаться / Людмила Минкевич // [Электронный ресурс]. – URL: http://news.tut.by/society/ 443736.html. – Дата доступа: 05.11.2014.

*5.* Музеефикация // Российская музейная энциклопедия [Электронный ресурс]. – URL: http://www.museum.ru/rme/rme.htm. – Дата доступа: 29.10.2014.

*6.* На пути к музею XXI века: сб. науч. тр. / редкол.: Н. А. Никишин (отв. ред.) [и др.]. – М. : НИИК, 1989. – С. 68–71.

*7. Федорук, А. Т.* Старинные усадьбы Берестейщины / А. Т. Федорук. – Минск : БелЭн, 2006. – 572 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ